*Сяргей Рыгоравіч Анісаў рана звязаў свой лёс з камсамолам, з партыяй. Ён — член КПСС з 1926 года. Працаваў на камсамольскай рабоце, у рэдакцыях газет «Чырвоная змена», «Рабочий». Пасля працяглы час правёў у падполлі ў Заходняй Беларусі — сакратаром ЦК КСМЗБ, сакратаром Брэсцкага акружкома КПЗБ. Амаль чатыры гады прабыў у польскіх турмах.*

*С. Анісаў — аўтар кніг «За волю і шчасце народа», «Крутымі шляхамі», «Палымянае юнацтва» і інш.*

*Зараз С. Р. Анісаў скончыў працу над дакументальнай аповесцю пра Сяргея Прытыцкага (падпольная мянушка «Аркаша») — аднаго з кагорты мужных рэвалюцыянераў-падпольшчыкаў Заходняй Беларусі, выдатнага сына беларускага народа.*

*Друкуем старонкі з гэтай аповесці.*

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# КРОК У БЕССМЯРОТНАСЦЬ

Невялічкі пакойчык. Схіліўшыся над сталом, Аркаша таропка пісаў—рыхтаваў справаздачу аб сваёй рабоце на Слонімшчыне. Часам заглядаў у невялічкі блакноцік, вымаў з кішэняў акуратныя лісткі. І раз за разам зацягваўся цыгаркай. Сіняваты дымок плаваў у пакоі, вісеў угары, пад столлю.

Раптоўна дзверы ў пакойчык расчыніліся.

— Роберт? — узрадавана ўсклікнуў Аркаша.

На парозе стаяў сакратар ЦК КСМЗБ. Гэта была іх першая сустрэча пасля школы кадраў падпольшчыкаў.

— Як маешся? Як даехаў? — загаварыў

Роберт і адчыніў фортку, каб праветрыць пакойчык.— Што з Дабрыянам? Дзе ён?

Аркаша маўчаў. Потым цяжка ўздыхнуў, прыглушана загаварыў, пыхкаючы цыгаркай:

— Наткнуўся на засаду... У Дзерачыне... Ужо два тыдні, як у турме...— Прыгадалася, як стары дакараў яго і Дабрыяна за правакатара Стральчука, і Аркаша з сумам працягваў:—І ўяві сабе, на вочнай стаўцы Стральчук нахабна заявіў яму: «Вось і сустрэліся, а ты што мне прарочыў?» і разам з дэфензіўшчыкамі пачаў біць яго...

Роберт стомлена прысеў на табурэтку, пацёр далонь аб далонь. Вестка пра Дабрыяна ўзрушыла яго. Дабрыян быў членам ЦК КСМЗБ, яны разам нядаўна вярнуліся з II з'езда КПЗБ. Аркаша, сочачы за кожным рухам Роберта, таксама хваляваўся. Яго непакоіла цяпер адно—чаму не выконваецца рашэнне ЦК КПЗБ і ЦК КСМЗБ у адносінах да правакатара.

— Чаму гэты прайдзісвет смуродзіць белы свет? — усхвалявана прамовіў Аркаша.

— Не такая гэта лёгкая справа, як здаецца каму-небудзь,—адказаў Роберт і як ачнуўся ад нейкай нечаканай дрымотнасці.

«Як здаецца каму-небудзь»,—паўтарыў у думках Аркаша і падумаў, што гэта было сказана і пра яго, але прамаўчаў. Роберт жа працягваў:

— Стральчука пільна ахоўвае паліцыя. Адзін ён нідзе не паяўляецца. Увесь час адседжваецца ў дэфензіве. На судзе выступае пад узмоцненай паліцэйскай аховай. Між намі кажучы, за ім ужо спрабавалі паляваць у Брэсце, Ашмянах, Свянцянах і тут, у Вільні, але, на жаль, без поспеху...

— У такім выпадку,—перапыніў яго Аркаша,— здрадніка трэба знішчыць у дэфензіве ці нават у зале суда!..

— Добра сказана. Але абы-каго туды не пашлеш...

— Я знайду, каго паслаць.

Роберт, пільна паглядзеўшы на Аркашу, сказаў:

— Паслаць людзей проста. А ведаеш, што таго, хто адважыцца на такое, чакае смерць?

— Ведаю.

— У такім разе, што сказаў бы ты, каб табе самому давялося гэта зрабіць?

Аркаша пакрыўдзіўся:

— Я хоць зараз гатовы да таго, каб расквітацца з мярзотнікам.

Роберт пачаў супакойваць хлопца, сказаў, што пажартаваў, але Аркаша не слухаў яго:

— Давай мне пісталет! Якія могуць быць жарты, калі гаворка ідзе пра гонар партыі! Даручыце мне расправу са Стральчуком.

— Добра. Я параюся і зайду да цябе заўтра,—адказаў Роберт.

У прынцыпе ён быў згодзен з Аркашам. Сапраўды, пакаранне Стральчука не трэба адцягваць. «Але ж трэба добра падрыхтавацца,— думаў ён, ідучы да Гардона.— З чаго ж пачаць гэтую падрыхтоўку?..»

Застаўшыся адзін, Аркаша таксама задумаўся. Не раз ён вяртаўся да таго, што сказаў яму Роберт,— трэба пакараць здрадніка ў дэфензіве ці ў судзе. І калі пачынаў прыкідваць, як лепш гэта зрабіць, міжволі пытаўся ў самога сябе: «А мо я пагарачыўся? Стральчука не бачыў у вочы. Як яго пазнаю там?..»

І яму ўяўлялася зала суда ў Гродна, дзе яму не аднойчы даводзілася бываць. А ў Вільні ён нават не ведаў, дзе знаходзяцца акруговы суд і дэфензіва. Ведаў адно, што ў Вільні, як і ў Гродна, будзе многа паліцыі, тайных агентаў. Расправу чыніць над здраднікам трэба будзе ў іх на вачах. Як гэта лепш зрабіць? Як сказаць пра ўсё гэта Роберту? Падумае, што ён, Аркаша, спалохаўся і адмаўляецца ад свайго слова.

Гаспадыня падала вячэру, але Аркаша есці адмовіўся, выпіў толькі шклянку чаю. Пасля яшчэ доўга мераў свой пакойчык неспакойнымі крокамі, выкурыў не адну цыгарку.

На наступны дзень да Аркашы зноў завітаў Роберт. У спартыўным касцюме, з канькамі на плячы. Твар яго гарэў бадзёрай чырванню.

«Малайчына, добра маскіруецца»,— падумаў пра яго Аркаша.

— Ты не перадумаў?—спытаўся адразу.

— Навошта лішнія размовы. Дзе зброя?..

— Чакай, чакай са зброяй. Ты разумееш, на што рашаешся?

— Безумоўна!..

— У такім разе вось табе пісталет,— і Роберт падаў Аркашу сямізарадны браўнінг старога ўзору.— Дваццаць пятага студзеня суд—будуць судзіць сямё-

ра камуністаў. Стральчук будзе даваць паказанні...

Убачыўшы, што Аркаша ўсю ўвагу пераключыў на пісталет, Роберт узяў у яго з рук зброю і пачаў тлумачыць, як з ёю абыходзіцца. Затым дастаў з кішэні карту-план горада.



С. Прытыцкі, 1933 г.

— Да суда застаецца тры дні,—пасля паўзы сказаў Роберт.—Пахадзі па горадзе. Прыгледзься, вось тут,—ён паказаў на плане,—чатырохпавярховы будынак. Гэта — акруговы суд. А побач — Лукішская плошча. На ёй некалі Мураўёў павесіў Кастуся Каліноўскага. Гістарычнае месца. Прыкінь вокам, дзе будынак суда. А зараз едзь у лес, на Антокаль, павучыся страляць.

Пасля, пакорпаўшыся ў адным з чаравікаў, Роберт выняў адтуль паперку — схему размяшчэння кабінетаў і залы пасяджэнняў акруговага суда:

— Вось дзверы ў кабінет пракурора. Ад дзвярэй ты атрымаеш ключ...

— Навошта мне лішнія ўлікі?— перапыніў яго Аркаша.

— Гэта не ўлікі, а гарантыя поспеху,— перапыніў яго Роберт і зноў паказаў на плане:—Калі стрэліш у правакатара, пачнецца паніка. Ты непрыкметна выскачыш з залы ў гэтыя дзверы, замкнеш іх і спакойна выйдзеш на вуліцу. Вось тут будзе чакаць фурман. Калі ж фурмана не будзе, ты зойдзеш у гэты дом, насупраць будынка суда,—гэта кватэра былой графіні. Яе сын, камсамолец, будзе цябе чакаць. Кватэра добра законспірыравана— гэта будынак корпуса пагранічных войск...

— Нічога мне гэта не патрэбна,—з пачуццём асуджанасці сказаў Аркаша.— Ведаеш, Роберт, калі я нават расправлюся з нягоднікам, то мне наўрад ці ўдасца выбрацца адтуль жывым. А можа, нават здарыцца і такое, што шпікі схопяць мяне раней, чым я стрэлю ў правакатара. Яго ж, дарэчы, я ніколі не бачыў.

— Не з гэтага, браце, пачынаеш,—Роберт спахмурнеў.—Усё будзе добра. Сёння ж ідзі да фатографа, сфатаграфуйся, калі ласка. Вось табе адрас. Картка патрэбна для тваіх дакументаў. За гэтыя дні ўсё абдумай як след. У залу мы думаем паслаць на дапамогу табе групу камсамольцаў. Яны ўчыняць перапалох, і табе лацвей будзе схавацца.

— Не трэба. Навошта лішнія ахвяры?..

Калі Роберт пайшоў, Аркаша доўга і ўважліва разглядаў план Вільні, у думках блукаў па незнаёмых вуліцах. На вуліцы Міцкевіча яму даводзілася быць не раз, але не ведаў, што тут і акруговы суд, і Лукішская плошча. «Трэба абавязкова пабыць там сёння»,—рашыў ён.

Ад фатографа з Вялікай Пагулянкі Аркаша пайшоў на вуліцу Міцкевіча. Быў марозны дзень, дзьмуў калючы вецер, але хлопец не адчуваў холаду. Аркаша ішоў паволі. Вось і будынак, у які яму трэба будзе зайсці. «А ці выйду я адсюль?..» Ён спыніўся непадалёк, на супрацьлеглым баку вуліцы. Дастаў цыгарэты і нетаропка закурыў. Ля ўваходу ў будынак суда і на вуліцы не было ні душы. Плошча таксама была бязлюдная. «Такой яна была, відаць, і ў часы вешацеля Мураўёва»,— падумалася чамусьці. Яшчэ

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

раз прайшоўшыся каля будынка, Аркаша паехаў за горад, у лес, каб патрэніравацца ў стральбе. Калі гаспадары ўляглiся, пачаў чысціць пісталет...

Увечары 24 студзеня да яго завітаў Роберт і прынёс пасведчанне члена ваеннай фашысцкай арганізацыі «Стралец», з якім Аркаша зможа прайсці ў залу суда. Прагаварылі яны да позняй ночы. Калі раніцой Аркаша прачнуўся, гадзіннік паказваў восем. А дзесятай павінен пачацца працэс. Пакуль шукаў фурмана, да пачатку суда спазніўся, у залу яго не пусцілі. Давялося чакаць перапынку. Калі ж пасля перапынку Аркаша прайшоў у залу, выявілася, што Стральчук ужо выступаў.

Увечары прыйшоў Роберт. Як заўсёды, быў ён у добрым настроі.

— Хачу ведаць, чаму ў зале не прагрымелі стрэлы?—па-сяброўску паціскаючы руку, спытаўся ён.

Аркаша вінавата пачаў тлумачыць, як усё сталася.

— Не адчайвайся,—перапыніў яго Роберт.—Можа, яно яшчэ і лепш. Ты пазнаёміўся з абстаноўкай. 27 студзеня будзе больш важны працэс—«Семнаццаці». У асноўным сярод абвінавачваемых па гэтай справе людзі, якія памагалі ЦК КСМЗБ, гаспадары кватэр і явак, а таксама камсамольскія работнікі Залашанская і Мадэйскер. Ты іх ведаеш. Усіх іх выдаў у рукі паліцыі Стральчук. На судзе ён будзе даваць паказанні.

Аркаша сказаў Роберту:

— Трэба было б падшукаць больш надзейную зброю.

— Зброя будзе! — сказаў Роберт.

У той жа вечар ён прынёс новы сямізарадны пісталет.

26 студзеня дзень выдаўся пахмурны, халодны. Уначы была мяцеліца — намяла гурбы снегу. Але Аркаша, паклаўшы ў кішэні абодва пісталеты, не ўседзеў дома—ён зноў выбраўся за горад, у лес: яшчэ раз папрактыкавацца ў стральбе.

Увечары на кватэры яго ўжо чакаў Роберт. Гаварылі аб розных дробязях, і толькі на развітанне Роберт абняў сябра:

— Поспеху табе, Аркаша!..

Раніцой, 27 студзеня, Аркаша прачнуўся раней і адразу ж накіраваўся на вуліцу Міцкевіча, у акруговы суд. Спакойна падняўся на трэці паверх, зайшоў у залу. Першыя рады ўжо былі занятыя. Нетаропка падышоў да сёмага рада і сеў на другое месца ад праходу. Абвёў вачыма залу. Падумаў: добра, што не спазніўся і заняў зручнае месца.

У гэты момант прывялі падсудных, пасадзілі за бар'ерам з рашоткай. Амаль усе былі яму знаёмыя — з імі Аркаша сустракаўся ці на яўцы, ці на рабоце.

Як заўсёды, падсудныя перш за ўсё шукалі вачамі ў зале знаёмых і родных. Залашанская першая сустрэлася позіркам з Аркашам і шапнула нешта Мадэйскер. Тая таксама ўтаропілася ў яго, таўханула пад бок суседа. Неўзабаве ўжо амаль усе падсудныя недаўменна пазіралі на Аркашу. Што яму тут трэба? Ці не такім ён стаў, як Стральчук?..

Заўважыўшы хваляванне сярод падсудных, заварушыліся іх сваякі, насцярожана азіраліся. Сышчыкі, якіх было нямала ў зале, таксама пачалі мацаць вачамі прысутных. Стваралася непрыемная сітуацыя. Аркаша сядзеў нібы на іголках. І добра, што неўзабаве пачуўся зычны голас судовага чыноўніка:

— Устаць! Суд ідзе!..

Судовы працэс «Семнаццаці» пачаўся з маруднага чытання абвінаваўчага заключэння. Пасля старшыня суда апытаў абвінавачаных, ці прызнаюць яны сябе вінаватымі. Усе далі адмоўны адказ.

Урэшце пачалася працэдура слухання сведак. Перад судом прайшла доўгая чарада чыноўнікаў паліцыі, сышчыкаў ці, як іх называлі ў народзе, шпіцляў, асведаміцеляў. Уся хеўра гэтых так званых сведак, паўтараючы завучаны тэкст, ганьбіла падсудных.

І так ажно пяць гадзін... «Ці хутка з'явіцца Стральчук?» Аркаша згараў ад нецярпення. Толькі пасля кароткага перапынку старшыня суда распарадзіўся:

— Запрасіце сведку абвінавачання Якава Стральчука.

Побач са сталом пракурора адчыніліся дзверы, і ў залу, азіраючыся, увайшоў Стральчук.

Падсудныя пачалі гнеўна пратэставаць:

— Які гэта сведка? Гэта здраднік!

— Прадажная шкура! Правакатар! Юдушка-здраднік!

— Вон нягодніка з залы!

Калі ў зале ўсталявалася цішыня, Стральчук падышоў да стала і пачаў паўтараць за суддзёй словы прысягі, затым схіліўся для пацалунку крыцыфікса.

Аркаша сачыў за кожным ягоным рухам. Пры думцы, што павінен забіць нягодніка, у яго цямнела ўваччу, хаця маральна і псіхалагічна быў даўно падрыхтаваны да гэтага. Калі б у тую хвіліну хто-

небудзьназіраў за ім, абавязкова ўбачыў бы, як спалатнеў ён.

Здраднік гаварыў ціха. У зале панавала цішыня, прысутныя стараліся не прапусціць міма вушэй ніводнага слова, бо ад яго паказанняў залежаў лёс падсудных. Раптам Стральчук узвысіў голас і, паказваючы пальцам на падсудных, аднаго за другім пачаў іх абзываць агентамі Масквы, служкамі бальшавікоў.

Аркаша імгненна выхапіў з кішэні абодва пісталеты і рушыў да судзейскага стала. Спачатку ішоў нетаропка, але, згадаўшы, што ў першых радах сядзяць сышчыкі і паліцэйскія чыны, ірвануўся наперад і ў момант апынуўся ля правакатара. З крыкам «Смерць здрадніку!» адначасова націснуў на абодва куркі.

Грымнулі два стрэлы. Стральчук упаў. Узнялася паніка. Суддзі, пракурор палезлі пад стол. Публіка кінулася да дзвярэй.

На ўсякі выпадак Аркаша паслаў у спіну здрадніка, які скурчыўся на падлозе, яшчэ дзве кулі і кінуўся з залы.

Яму трэба было бегчы праз бакавыя дзверы, а адтуль праз чорны ход выйсці на вуліцу. Ён жа рушыў да галоўнага выхаду. У праходзе было шмат людзей, а дзверы зачынены. Убачыўшы пісталеты ў руках Аркашы, публіка расступілася, дала яму дарогу. Апынуўшыся каля зачыненых дзвярэй, ён з разгону плячом адчыніў іх і... апынуўся сярод сышчыкаў і паліцэйскіх. Сустрэча была поўнай нечаканасцю і для Аркашы, і для іх. Яны, пачуўшы стрэлы ў зале, памкнуліся туды, але не маглі адчыніць дзверы. Убачыўшы ў руках юнака пісталеты, сышчыкі спалохана прыціснуліся да сцяны, паднялі рукі ўгору:

— Даруй, пан, жыце!..

Аркаша помніў наказ Роберта: не рабіць лішніх ахвяр. Ды і сам добра ведаў, што забойства хоць бы аднаго паршывага шпіцля ці паліцэйскага выкліча з боку ўлад новую хвалю крывавага тэрору супраць камуністаў. Ён махнуў рукой і моўчкі пабег уніз па лесвіцы, спадзеючыся хутчэй выскачыць на вуліцу. У гэты час сышчыкі Дайноўскі і Бучкоўскі, якія толькі што прасілі ў Аркашы літасці, выхапілі пісталеты і ўсчалі страляніну.

Ён паспеў прабегчы толькі першую лесвічную клетку. Яго ўжо дагналі кулі. Адна трапіла ў правы бок, другая — у левы, трэцяя — у шыю, чацвёртая — у руку... Аркаша захістаўся і, як падсечанае дрэва, упаў. Адразу ж на яго наляцела зграя сышчыкаў і паліцэйскіх. Абшукалі і тут жа, на лесвіцы, пачалі допыт. Яны спяшаліся: стан цяжка параненага Аркашы быў крытычны.

Нягледзячы на цяжкія раны, Аркаша моўчкі, з пагардай глядзеў на паліцэйскіх. І калі судовы следчы Адам Шэлькінг, які прыбег сюды, спытаўся ў юнака: «Што з табой?», Аркаша адказаў: «Не твая справа». Збіты з панталыку такім адказам, следчы спытаў: «Адкуль родам?» «З вёскі»,— пачулася ў адказ. «Хто страляў?» — працягваў следчы. «Я страляў у правакатара і здрадніка працоўных»,— паспеў сказаць Аркаша і страціў прытомнасць...

Калі да яго вярнулася прытомнасць, ён сказаў толькі, што завуць яго Сяргей Прытыцкі, што родам ён з вёскі Гаркавічы на Гродзеншчыне. На іншыя пытанні, як ні стараўся следчы, ён не адказваў.

Тым часам прыбыла карэта хуткай дапамогі. Знясіленага, яго паклалі на насілкі і вынеслі з будынка суда. На Лукішскай плошчы ўжо сабраўся натоўп.

«Няхай ведаюць з нашых вуснаў, а не ад нашых ворагаў»,— рашыў Сяргей Прытыцкі і, сабраўшы ўсе свае сілы, закрычаў:

— Смерць правакатарам! Далоў фашысцкі ўрад! Няхай жыве пралетарская рэвалюцыя!

Стрэлы Сяргея Прытыцкага выклікалі паніку не толькі пад скляпеннямі Віленскага акруговага суда. Рэха іх разнеслася па ўсёй Польшчы.

Амаль дзве старонкі ўборыстага тэксту адвяла гэтай падзеі газета «Слова». Гэты чарнасоценны лісток не скупіўся на розныя эпітэты, запазычаныя ў гітлераўскіх пісак, калі гаварыў пра падсудных, і ўсімі спосабамі стараўся абяліць дзеянні правакатара.

«...Суду даваў свае паказанні Стральчук,— пісала газета.— У такт яго словам пачуліся нервовыя і хуткія крокі. Стральчук не бачыў, што з публікі, якая знаходзілася ў зале, выйшаў чалавек з неяўрэйскім аблччам,— у правай руцэ рэвальвер, накіраваны ўгору. Пачуўся стрэл,— куля засела ў сцяне недзе над галовамі сведкі і суддзяў. Хуткія крокі, і злачынца, амаль упіраючыся ў спіну сведкі Стральчука, схіленага ў бок суддзяў, прыдушаным, перацятым голасам крычыць: «Вось табе, вось, здраднік!» Адначасова чуюцца стрэлы — тры... ча-



З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы